## ТВОРЧАСЦЬ НЕ ВЕДАЕ МЕЖАЎ

Сем дзён, з 1 па 7 лістапада, наш універсітэт жыў святам — святам мастацтва і творчасці. У прыўзнятую атмасферу I Міжнароднага фестывалю моладзі «Арт-сесія» Гомель-94 уліліся і ўсе вышэйшыя навучальныя ўстановы абласнога цэнтра. На працягу тыдня развяваліся над будынкам вучэбнага корпуса №1 сцягі краін — удзельніц фестывалю і флаг, узняты ў яго гонар на ўрачыстым адкрыцці 1 лістапада.

У той вечар на залітай святлом пляцоўцы перад корпусам №1 у 19.00 сабраліся ганаровыя госці, гаспадары свята, студэнты ВНУ горада. Іх цёпла вітаў рэктар ГДУ акадэмік Л.А.Шамяткоў, а дзяўчаты ў нацыянальных беларускіх касцюмах уручылі кіраўнікам замежных дэлегацый традыцыйны хлеб-соль.

На фестываль у горад над Сожам прыехалі прадстаўнікі французскага і індыйскага пасольстваў, работнікі міністэрстваў адукацыі і навукі, культуры і друку Беларусі.

Канцэрты, знаёмствы з творчымі маладзёжнымі калектывамі горада, цікавыя экскурсіі і проста незапланаваныя сустрэчы і гутаркі замежных гасцей з гомельскім студэнцтвам цяпер ужо ў мінулым — I Міжнародны фестываль моладзі адыходзіць у гісторыю. І гэтая першая ластаўка ў творчым узбагачэнні культур краін розных кантынентаў прынясе, безумоўна, вялікую ўзаемную карысць усім яго ўдзельнікам, бо сапраўднаму мастацтву, высокай культуры і далёкія адлегласці паміж краінамі — не перашкода.

(Матэрыялы аб фестывалі «Арт-сесія» чытайце на 4-7 старонках нашай газеты.)


ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт



№ 17 (879) | Аўторак 15 лістапада 1994 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная


## НА ВУЧОНЫМ САВЕЦЕ

У традыцыйны апошні чацвер месяца, 27-га кастрычніка, адбылося чарговае пасяджэнне савета універсітэта.

Першым на парадку дня стала пытанне аб рабоце кафедры рускай мовы для замежных навучэнцаў, па якому выступіла яе загадчыца Г.А.Даўгяла.

Вучоны сакратар Л.Я.Палякоў далажыў аб выкананні рашэнняў вучонага савета за 1993-94 навучальны год.

Прарэктар па навуковай рабоце А.М.Сердзюкоў вынес на абмеркаванне рэкамендуемыя на конкурс у Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь навукова-даследчыя работы, фінансуемыя са сродкаў дзяржбюджэта.

На вакантныя пасады па конкурсу абраны: кандыдат псіхалагічных навук, дацэнт Б.М.Зайцаў -- дацэнтам кафедры тэорыі і методыкі фізічнай культуры; кандыдат гістарычных навук А.А.Макушнікаў -- старшым выкладчыкам кафедры ўсеагульнай гісторыі; кандыдаты філалагічных навук, старшыя выкладчыкі кафедры беларускай мовы У.А.Бобрык і Л.П.Кузьміч -- дацэнтамі названай кафедры; кандыдаты філалагічных навук, старшыя выкладчыкі кафедры нямецкай і французскай моў С.М.Калацэй і В.В.Чэркас адпаведна дацэнтам і ст. выкладчыкам названай кафедры. Кандыдат філалагічных навук дацэнт Д.Д.Паўлавец перавыбраны на пасаду загадчыка кафедры беларускай культуры, а кандыдат педагагічных навук, дацэнт Г.І.Нарскін перавыбраны загадчыкам кафедры лячэбнай фізічнай культуры. Кандыдат эканамічных навук Б.У.Сарвіраў выбраны на пасаду дацэнта кафедры эканамічных тэорый, а кандыдат фізіка-матэматычных навук Я.А.Дэй -- дацэнта кафедры тэарэтычнай фізікі.

Зацверджана камісія па падрыхтоўцы і правядзенню святкавання 50-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

Разгледжаны таксама некаторыя іншыя пытанні універсітэцкага жыцця. У прыватнасці, загадчык кафедры агульнай фізікі доктар фізіка-матэматычных навук Д.Р.Лін рэкамендаваны да прысваення яму ганаровага звання "Заслужаны вынаходнік Рэспублікі Беларусь".

## КАМІСІЯ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ І ПРАВЯДЗЕННЮ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ, ПРЫСВЕЧАНЫХ 50-годдзю ПЕРАМОГІ Ў ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЕ

ВОІНАЎ М.М. --прарэктар па вучэбнай рабоце, старшыня камісіі.

СТАРАВОЙТАЎ М.І. -- дэкан гісторыка-юрыдычнага факультэта, намеснік старшыні камісіі.

ВАРАТНІЦКІ Г.І. -- старшыня прафкома.

КОЛТЫШАВА Н.І. -- старшыня прафкома студэнтаў.

ЛЕВАНЦОЎ В.М. -- старшыня камітэта Саюза моладзі.

БАЛОГА У.П. -- рэдактар газеты "Гомельскі універсітэт".

ЛЫСЯНКОЎ А.В. -- дырэктар клуба мастацкай самадзейнасці.

ЖАРКОЎ Д.М. -- дырэктар спартклуба.

АНІЧЭНКА У.В., ЕЎДАКІМЕНКА Г.С., КАЛУПН А.С., КОСЦІКАЎ А.А., ЯНКОВА Т.С. -- ветэраны Вялікай Айчыннай вайны.

КАСЦЮЧЭНКАВА В.М. -- загадчыца бібліятэкі.

ЭНЦІН Э.М. -- загадчык кафедры гісторыі Беларусі.

ЭСМАНТОВІЧ І.Ф., ЯЗЭПАВА Т.І. -- дацэнты кафедры гісторыі Беларусі.

## ВІНШУЕМ!

Рэктарат, грамадскія арганізацыі, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты горача віншуюць доктара філалагічных навук **КАЗЛОВУ Раісу Міхайлаўну** з кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства і дэкана геолага-геаграфічнага факультэта кандыдата геолага-мінералагічных навук **ПІНЧУКА** Адама Пятровіча з прысваеннем ім Атэстацыйнай калегіяй Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь вучонага звання **ПРАФЕСАР**.

## ІСПАНІЯ -- НОВЫ АДРАС СУПРАЦОЎНІЦТВА

Усё больш краін становіцца ў Заходняй Еўропе з навуковымі ўстановамі, якіх наш універсітэт устанаўлівае і паглыбляе навуковыя сувязі. У кастрычніку г.г. да іх прыбавілася і Іспанія. Па запрашэнню кіраўніцтва універсітэтаў гарадоў Валенсія і Памплона сюды выязджаў у навуковую камандзіроўку рэктар ГДУ член-карэспандэнт АН Беларусі прафесар Л.А.Шамяткоў. Усе выдаткі на яго паездку, уключаючы кошт авіябілетаў у суме 1200 долараў, узяў на сябе іспанскі бок. У зарубежжы Леанід Аляксандравіч займаўся навуковай работай сумесна з іспанскімі калегамі, на матэматычных факультэтах абодвух універсітэтаў выступаў з навуковымі дакладамі. Яны выклікалі вялікую цікавасць. Сведчаннем таму з"яўляецца прыезд у Памплонскі універсітэт вучоных-матэматыкаў з Сарагоскага універсітэта, які знаходзіцца за 200 км, каб паслухаць выступленні шырока вядомага за межамі нашай рэспублікі беларускага алгебраіста.

Л.А.Шамяткоў знаходзіўся ў Іспаніі на працягу 12 дзён. Ад гэтай паездкі ў яго засталося шмат уражанняў, якімі ў адным з бліжэйшых нумароў ён падзеліцца з чытачамі нашай газеты.

# ЯКОЕ СЁННЯ САЦЫЯЛЬНАЕ САМААДЧУВАННЕ СТУДЭНТА ?

## Аб гэтым ішла размова на справаздачна-выбарнай прафсаюзнай канферэнцыі

**Як паведамлялася ў нашай газеце, 26-га кастрычніка адбылася XIII справаздачна-выбарная прафсаюзная студэнцкая канферэнцыя. На ёй заслуханы і абмеркаваны справаздачы прафкома за апошнія два гады, яго рэвізійнай камісіі, выбраны новыя саставы прафсаюзнага камітэта, рэўкамісіі, дэлегаты на абласную прафсаюзную канферэнцыю.**

**Ш**то ў сённяшніх нялёгкіх умовах жыцця можа зрабіць для студэнта прафсаюз, як ён абараняе яго інтарэсы? Аб гэтым ішла размова ў справаздачным дакладзе, з якім выступіла старшыня прафкома студэнтаў ГДУ Н.І. Колтышава. Адзначалася, што з 4 237 студэнтаў універсітэта 4 210 з'яўляюцца членамі галіновага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі, які, у сваю чаргу, уваходзіць у Асацыяцыю студэнцкіх прафсаюзных арганізацый Беларусі. Гэтая Асацыяцыя каардынуе дзейнасць 42 рэспубліканскіх вузаўскіх прафсаюзных арганізацый, а таксама 134 з сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў.

Якое ж сёння сацыяльнае самаадчуванне студэнта? Прэзідэнтам Беларусі выдадзены Ўказ аб павышэнні стыпендыі студэнтам да 130% ад мінімальнай заработнай платы -- 26 тыс. руб. Выплачваецца таксама 8 тыс.руб. штомесячна на харчаванне плюс да гэтага 50% ад памеру стыпендыі за пражыванне ў зоне радыелагічнага кантролю. Не атрымліваюць даплату ў 8 тыс. руб. студэнты, якія мелі нездавальняючыя адзнакі ў сесію, а таксама тыя, хто вучыцца на стыпендыю ад прадпрыемстваў. Маці-студэнткі ( а іх ва універсітэце 127) атрымліваюць грашовыя дапамогі на дзяцей -- штомесячна 120% ад мінімальнай заработнай платы, пры нараджэнні дзіцяці -- тры мінімальныя зарплаты. Тым, хто не мае месца ў інтэрнаце і здымае прыватную кватэру, выплачваецца кампенсацыя ў памеры 25% ад мінімальнай зарплаты.

Адным з абавязкаў прафсаюза з'яўляецца клопат аб стварэнні здаровых і бяспечных умоў вучобы і быту. Прафсаюзная арганізацыя ГДУ, як адзначалася ў справаздачы, імкнецца гэта рабіць з усёй сур'ёзнасцю. Ва універсітэце распрацавана комплексная праграма "Здароўе", якая прадугледжвае шэраг мерапрыемстваў па паляпшэнню ўмоў працы і ўмацаванню здароўя студэнтаў, прафілактыцы захворванняў. Аднак, самі студэнты мала клапоцяцца аб сваім здароўі, і сёння на дыспансерным уліку -- 146 хворых юнакоў і дзяўчат, 428 наведваюць спецмедгрупу на занятках фізічнай культуры. Найпершая задача прафкома ў такіх выпадках -- забяспечваць маючых адхіленні ў здароўі маладых людзей пуцёўкамі на лячэнне, аздараўленне. Вялікую дапамогу тут аказвае калектыў універсітэцкага санаторыя-прафілакторыя, дзе штогод могуць падмацоўваць сваё здароўе 1200 студэнтаў. Атрымліваюць члены прафсаюза пуцёўкі ў санаторыі, дамы адпачынку, на турбазы. Праўда, колькасць іх у апошні час прыкметна зменшылася з-за развалу СССР, інфляцыі.

**В**а ўмовах рынку, жорсткай канкурэнцыі дрэнным спецыялістам будзе нялёгка знайсці сабе работу. Вось чаму галоўным клопатам студэнта застаецца паспяховая вучоба. Гэта думка падкрэслівалася і ў справаздачным дакладзе. Лічбы, якія характарызуюць узровень ведаў студэнтаў ГДУ, не вельмі радасныя: агульны працэнт паспяховасці складае па універсітэту па стану на 1 кастрычніка бягучага навучальнага года 80% ( з улікам ліквідацыі запазычанасцей). Пытанне якасці паспяховасці ў многім залежыць і ад пярвічных прафсаюзных арганізацый акадэмічных груп. Ужо два гады, як ва універсітэце няма свабоднага наведвання заняткаў, як гэта дазвалялася раней. Але многія студэнты ігнаруюць гэтае патрабаванне, з'яўляюцца на занятках несістэматычна. Кантраляваць стан дысцыпліны ў студэнцкім калектыве, весці работу па яе ўмацаванню -- адна з важных задач у рабоце пярвічных ячэек груп.

Адно з вострых на сённяшні дзень пытанняў -- забеспячэнне студэнтаў ГДУ інтэрнатамі. Вось ужо на працягу чатырох гадоў не ўсе юнакі і дзяўчаты, якія маюць у ім патрэбу, атрымліваюць ў іх жаданае месца і таму вымушаны здымаць прыватнае жыллё за высокую плату. Аднак, трэба з горыччу канстатаваць, што тыя, хто жыве ў інтэрнаце, паводзяць сябе не лепшым чынам. Беспарадак у пакоях, выбітыя шыбы ў месцах агульнага карыстання, бруд, смецце -- некрасамоўны паказчык ўзроўню культуры студэнтаў.

Ва універсітэце ёсць аддзел па рабоце ў інтэрнатах, але ўсе праблемы ён вырашыць не ў стане, таму што многае залежыць ад саміх студэнтаў. Нізкая культура моладзі праяўляецца, на жаль, не толькі ў інтэрнатах. У вучэбных карпусах, здараецца, можна назіраць таксама не вельмі прыемныя малюнкі. Загад рэктара аб забароне курэння ва універсітэце многія ігнаруюць -- шэрыя клубы цыгарэтнага дыму можна ўбачыць не толькі ў туалетах, але і ў калідорах, на лесвічных пляцоўках. У навядзенні належнага парадку павінны прымаць удзел і прафсаюзныя бюро факультэтаў. Цяпер ва універсітэце зноў вярнуліся да сістэмы куратарства, што павінна станоўча паўплываць на студэнцтва, яго выхаванне.

За справаздачны перыяд сярод студэнтаў актывізавалася работа спартыўна-масавага і аздараўленчага накірунку. Яна ставіць сваёй мэтай прапаганду здаровага ладу жыцця моладзі, укараненне фізічнай культуры і спорту ў быт студэнтаў. Адсутнасць добрай спартыўнай базы перашкаджае ў рабоце, але ўсё ж універсітэту ёсць і чым пахваліцца. Толькі за мінулы год у ГДУ падрыхтавана 4 майстры спорту міжнароднага класа і 6 майстроў спорту Рэспублікі Беларусь, 39 студэнтаў удзельнічалі ў чэмпіянатах і Кубках свету, Еўропы, рэспублікі. 11 з іх станавіліся чэмпіёнамі, 19 -- сярэбранымі і бронзавымі прызёрамі. 25 студэнтаў-спартсменаў уваходзяць у асноўны састаў нацыянальнай зборнай каманды Беларусі.

Аб праблемах, недахопах, хвалюючых моладзь пытаннях гаварылі на канферэнцыі выступіўшыя ў спрэчках прафсаюзныя лідэры факультэтаў, студэнты **І.Прысяжны, А.Айвазбалян, А.Аўдзеенка, У.Меляneўскі, Т.Бібік, Р.Банькоўскі** і інш. Ішла размова аб неабходнасці ўвядзення льготнага праезду на прыгарадным транспарце.Не вытрымлівае ніякай крытыкі матэрыяльная база студэнтаў -- будучых юрыстаў. Няма па чым займацца, падручнікі адсутнічаюць. Дрэнна забяспечаны інвентаром, прыборамі студэнты-геолагі ў час практык. Гаварылася аб неадпаведнасці памеру грашовай кампенсацыі, якая выплачваецца студэнтам, рэальнай аплаце за кватэру і інш. Выказваліся прапановы па рашэнню праблем, над якімі трэба будзе працаваць прафкому.

**Н**а канферэнцыі прынята рэзалюцыя, у якой прадугледжваецца пашырыць сістэму студэнцкага ўплыву ў групах, павысіць самастойнасць і адказнасць студэнтаў за вынікі сваёй працы.

У рабоце справаздачна-выбарнай канферэнцыі прынялі ўдзел сакратар абкома галіновага прафсаюза **Н.І.Аліферэнка,** прарэктар па вучэбнай рабоце **М.М.Воінаў.**

На новы тэрмін старшынёй прафкома студэнтаў зноў абрана **Н.І.Колтышава**, яе намеснікам -- **Я.В.Пышняк.**



*СПРАВАЗДАЧЫ І ВЫБАРЫ Ў ПРАФСАЮЗАХ*

# ПРЫ ЖОРСТКІХ ПАТРЭБАХ ЖЫЦЦЯ

**П**рафсаюзная арганізацыя выкладчыкаў і супрацоўнікаў нашага універсітэта налічвае ў сваіх радах 1140 членаў. Кожны дзесяты з іх быў абраны на XIV справаздачна-выбарную канферэнцыю, якая адбылася 31 кастрычніка. На ёй падводзіліся вынікі праведзенай работы за перыяд з 24 лістапада 1992 года.

Са справаздачным дакладам прафкома выступіў яго старшыня Г.І.Варатніцкі. На пачатку ён гаварыў аб глыбокім крызісным становішчы, у якім апынулася Беларусь пасля распаду СССР, і ролі галіновага прафсаюза ў барацьбе за недапушчэнне ўсё больш адчувальнага зніжэння жыццёвага ўзроўню людзей. Прыводзіліся прыклады, калі рашучыя дзеянні прыводзілі да рэалізацыі асобных сацыяльных патрабаванняў з боку ўрада.

І ўсё ж па-ранейшаму для кожнага з нас самым хвалюючым застаецца пытанне, як выжыць у крайне складаных эканамічных умовах, калі павышэнне заработнай платы ўсё больш адстае ад тэмпаў росту цэн на прадукты, прамысловыя тавары, усе віды паслуг.

У справаздачы з дастатковай паўнатой асветлена дзейнасць прафкома па сацыяльнай абароне членаў прафсаюза. У прыватнасці, толькі за мінулы год была аказана матэрыяльная дапамога 165 супрацоўнікам амаль на паўмільёна рублёў. Сёлета яе атрымалі 170 членаў прафсаюза, якім выплачана 760 тысяч рублёў.

Не забывае прафком і пенсіянераў -- былых супрацоўнікаў універсітэта. За леташні і бягучы гады была аказана матэрыяльная дапамога адпаведна 13 і 15 чалавекам, выдзелена 16 і 13 пуцёвак на санаторнае лячэнне, у тым ліку 8 і 9 -- бясплатна.

**Д**акладчык падкрэсліў, што аздараўленне членаў універсітэцкага калектыву стала галоўным клопатам прафкома. Гэта выклікана тымі ўмовамі, у якіх мы апынуліся пасля чарнобыльскай катастрофы. Названы лічбы, якія характарызуюць плённую работу прафсаюзнага камітэта і яго актывістаў у гэтым накірунку. Летась і сёлета было набыта і размеркавана розных пуцёвак значна больш устаноўленай нормы. Пры выдзяленні пуцёвак перавага аддавалася няпоўным сем"ям, хворым дзецям, ліквідатарам аварыі на ЧАЭС. Апошнім -- бясплатна. Сёлета праз фонд "Дзеці Чарнобыля" упершыню ўдалося арганізаваць паездку 17 дзяцей супрацоўнікаў універсітэта на аздараўленне ў польскіх сем'ях.

У аздараўленні выкладчыкаў і супрацоўнікаў важная роля належыць універсітэцкаму санаторыю-прафілакторыю. Так, толькі сёлета пуцёўкі ў яго былі выдзелены для 147 чалавек. Але нельга дапускаць, па словах дакладчыка, каб на працягу года адны і тыя ж людзі карысталіся імі па некалькі разоў. У пацвярджэнне сказанага ён прывёў факты.

Менавіта на аздараўленне членаў нашага калектыву, заначыў Г.І.Варатніцкі, расходуецца асноўная частка прафсаюзнага бюджэту. Значныя сродкі выдзяляюцца на культурна-масавыя мерапрыемствы. Гэта -- аплата дзіцячых навагодніх падарункаў, дзіцячых білетаў у цырк, расходы на "агеньчыкі-сустрэчы" з нагоды знамянальных дат, ушанаванне юбіляраў і ветэранаў. Прафком фінансуе і арэнду плавальнага басейна, дзе пад кіраўніцтвам дацэнта В.Л.Мярэжы ўмацоўваюць сваё здароўе аматары блакітных дарожак.

**А**пошнія два гады прафком, гаварыў далей яго старшыня, займаецца, на першы погляд, не ўласцівай для сябе работай -- забеспячэннем работнікаў універсітэта, пенсіянераў жыццёва важнымі таварамі народнага спажывання. Але ў наш вельмі складаны час гэта стала крайне неабходным.

Прафком пры актыўнай дапамозе адміністрацыі па магчымасці імкнецца забяспечыць усіх жадаючых зямельнымі ўчасткамі. У шасці наяўных дачных кааператывах іх маюць ужо сем"і 225 выкладчыкаў і супрацоўнікаў. Цяпер афармляецца дакументацыя на замацаванне за універсітэтам у Гомельскім раёне яшчэ аднаго зямельнага ўчастка, дзе змогуць атрымаць надзелы па 10 сотак каля 40 чалавек.

У справаздачы прафкома закранута і жыллёвая праблема. Яна па- ранейшаму застаецца вельмі вострай. Цяпер у чарзе на дзяржаўнае жыллё /выдзяленне і паляпшэнне/ -- 84 чалавекі, кааператыўнае -- 32. За мінулы і сёлетні гады гарсаветам выдзелены універсітэту толькі адна двухпакаёвая і адна трохпакаёвая кватэры. Яны размеркаваны па спісу ГДУ на ЖБК.

Вельмі з вялікай цяжкасцю была атрымана адна дзяржаўная трохпакаёвая кватэра, якую ў адпаведнасці з чаргой атрымаў дацэнт Л.І.Перцаў.

У будучым паляпшэння з жыллёвым будаўніцтвам, асабліва за дзяржаўныя сродкі, не прадбачыцца. Таму вельмі разумна паступіла адміністрацыя універсітэта, рэалізаваўшы наяўныя магчымасці. За кошт вызваленай плошчы ў інтэрнаце N3 /вул.Савецкая, 106/ палепшаны жыллёвыя ўмовы для 23 сем"яў.

Дакладчык праінфармаваў дэлегатаў канферэнцыі таксама аб некаторых выніках навукова-даследчай работы, навуковых сувязях універсітэта. Значная ўвага ў справаздачы была ўдзелена рабоце адміністрацыйна-гаспадарчай часткі, некаторых яе звенняў. На ўтрыманне карпусоў і інтэрнатаў, дапаможных збудаванняў трацяцца дзесяткі мільёнаў рублёў. І ўсё ж наяўнага фінансавання крайне недастаткова. Разам з тым мы яшчэ не навучыліся ашчадна адносіцца да дзяржаўнай маёмасці, берагчы свае рэсурсы, падтрымліваць парадак на кожным рабочым месцы, не дапускаць парушэння правілаў тэхнікі бяспекі і аховы працы. Гэтыя і іншыя пытанні ў большай або меншай меры закраналіся ў справаздачы, ажыўлена, іншы раз нават празмерна эмацыянальна абмяркоўваліся дэлегатамі.

На канферэнцыі Г.І.Варатніцкі гаварыў аб пытаннях, якія разглядаліся на пасяджэннях прафкома і аб тым, як выконваліся прымаемыя рашэнні, аб рабоце пастаянных камісій. Па зробленаму ім пераліку прысутнасці на пасяджэннях прафкома прадставілася магчымасць зрабіць вывад, што асобныя яго члены не зусім добрасумленна адносіліся да выканання сваіх грамадскіх абавязкаў.

Са справаздачай рэвізійнай камісіі выступіў яе старшыня І.К.Кекіш.

**П**ры абмеркаванні заслуханых справаздач выступілі старшыня пастаяннай камісіі прафкома па тэхніцы бяспекі і ахове працы У.С.Стрыжнёў, член прафбюро фізічнага факультэта У.А.Замятнін, старшыня Савета ветэранаў вайны і працы А.А.Косцікаў, член прафкома П.Д.Грыгарук, асістэнт эканомфака Э.І.Лізарава, галоўны механік А.М.Алісіевіч, старшыня прафбюро ІВЦ Н.Г.Дрынеўская. З цікавасцю было выслухана выступленне рэктара Л.А.Шаматкова. Ён падзяліўся ўражаннямі аб навуковай паездцы ў Іспанію, даў станоўчую ацэнку рабоце прафкома, расказаў аб асноўных задачах, над вырашэннем якіх павінны працаваць цяпер калектыў універсітэта і яго прафсаюзная арганізацыя.

Дэлегаты канферэнцыі прынялі пастанову, станоўча ацанілі работу прафкома за справаздачны перыяд і зацвердзілі справаздачу рэвізійнай камісіі. Выбраны новыя саставы прафкома і рэвізійнай камісіі, дэлегаты на абласную справаздачна-выбарную канферэнцыю галіновага прафсаюза.

Старшынёй прафкома на новы тэрмін аднагалосна абраны **Г.І.Варатніцкі.**

У рабоце канферэнцыі прыняла ўдзел і выступіла сакратар абкома прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі **Н.І.Аліферэнка.**

*У любой справе, якую распачынаеш упершыню, не ўсё атрымліваецца адразу. Гэтай вядомай ісцінай можна суцешыцца і арганізатарам I Міжнароднага фестывалю моладзі "Арт-сесія", які тыдзень назад завяршыўся ў нашым універсітэце. Не ўсё ў ім удалося -- па розных прычынах не змаглі прыехаць у Гомель некаторыя замежныя дэлегацыі, не зусім адпавядаў маштабам фестывалю памер актавай залы ГДУ, у якую на праграмныя мерапрыемствы свята не маглі трапіць многія сотні студэнтаў нашага універсітэта, не кажучы ўжо пра астатнія ВНУ горада. Здараліся і прыкрыя тэхнічныя збоі.*

*І ўсё ж можна сцвярджаць: "Арт-сесія", пачатак якой пакладзены ў нашым горадзе, сваю галоўную ролю выканала -- дала імпульс далейшаму ўмацаванню творчых і сяброўскіх кантактаў паміж моладдзю, ды і не толькі ёй, з краін блізкага і далёкага замежжа.*

# ФЕСТЫВАЛЬНЫЯ СУСТРЭЧЫ

За цэлы тыдзень іх было шмат. Перад канцэртамі і пасля іх, на вечары сяброў, які сабраў 5 лістапада гасцей і гаспадароў фестывалю, і проста ў перапынках паміж праграмнымі мерапрыемствамі.

Моўны бар'ер у час знаёмства з французамі і шатландцамі дапамагалі пераадольваць і выкладчыкі, і студэнты універсітэта, якія ўзялі на сябе абавязкі перакладчыкаў.

У час кожнай гутаркі з замежнымі гасцямі хацелася больш даведацца не толькі аб іх творчасці /успомнім назву -- "Арт-сесія"/, але і аб жыцці, у многім для нас невядомым, і аб уражаннях ад нашага горада, універсітэта.

Першым, і бадай, самым яркім і памятным для мяне асабіста было знаёмства з шатландцамі. Адразу кідалася



ў вочы, прываблівала іх каларытнасць: мужчыны -- у традыцыйным нацыянальным адзенні -- клятчастых спадніцах. Нельга было не выдзеліць сярод іх ветлівага, усмешлівага Джэйсана Макбейна з нязменным яго спадарожнікам -- валынкай. Яе чароўныя і моцныя гукі, якія інструмент выдаваў дзякуючы майстэрству прафесіянала, пакарылі ўсіх. Як высветлілася ў час нашага інтэрв'ю, Джэйсан -- штатны музыкант мэрыі г.Абердзіна, і яму даводзіцца часта знаёміць замежных гасцей з шатландскім музычным мастацтвам. У Беларусі ён упершыню, а вось у Расіі, у падмаскоўным г.Жукоўскім -- пабрацíме шатландскага гарадка Інверуры -- яму даводзілася ў саставе дэлегацыі бываць раней. На фестывалі ў Гомелі ён хацеў пазнаёміцца з беларускай нацыянальнай музыкай, паспрабаваць адшукаць сярод музычных народных інструментаў нашай рэспублікі нешта падобнае на шатландскую валынку. І Джэйсану гэта ўдалося. Ён з радасцю паведаміў мне аб гэтым у канцы фестывалю -- беларускую валынку яму паказалі члены гомельскай "Талакі". А яшчэ шатландскі госць адзначыў асаблівую гасціннасць, добразычлівасць, шчырасць беларусаў, якіх яму, удзельніку многіх міжнародных фестываляў, не даводзілася так адчуваць нідзе, як тут, у Гомелі. Ні самыя фешэнебельныя гатэлі, ні найсучаснейшыя супермаркеты Захаду ён не ставіць у параўнанне з адкрытасцю і багаццем душы беларусаў.

Такой жа думкі прытрымліваліся і яго сябры, астатнія ўдзельнікі шатландскай дэлегацыі -- абаяльныя Клер Ліндлі і Джон Мітчэл /дуэт скрыпкі і гітары "Грын"/, выступленні якіх на канцэртах фестывалю прыводзілі ўсю залу ў захапленне, а таксама студэнты універсітэта Абердзіна Рычард і Элісон.

◆ ◆ ◆

Своеасабліва выглядала на фестывалі дэлегацыя з Францыі -- правінцыі г.Клермон-Ферана. У першую чаргу яна адрознівалася ад іншых саставам удзельнікаў. Тут былі і людзі сталага ўзросту, і дзеці. Гэты аматарскі фальклорны ансамбль танца "La BOVRREE YSSOIRIENNE" з правінцыі Авернь прадэманстраваў не толькі сваё самабытнае цікавае мастацтва /танцы многіх дэпартаментаў правінцыі/, але і наглядна паказаў, як неабходна развіваць і свята захоўваць культурныя традыцыі народа. У Францыі няма прафесійных дзяржаўных танцавальных школ, таму ў сем'ях старэйшыя імкнуцца перадаваць сваё майстэрства, вопыт, культурныя звычаі моладзі -- дзецям і ўнукам. Наглядны прыклад гэтаму -- названы ансамбль, у якім танцуюць бацькі, іх дзеці, унукі, мужы з жонкамі і г.д. У самога кіраўніка калектыву Жана Люка Вернерэ -- яго жонка -- акампаніятар, а два сыны і дачка -- танцоры. У нацыянальных касцюмах і не менш цікавым абутку -- драўляных сабо пад гарачыя апладысменты гледачоў паказвалі самыя розныя танцы свайго народа французскія госці. Па іх запрашэнню падымаліся



на сцэну і ўдзельнічалі ў танцы жадаючыя з глядзельнай залы, за што потым былі пачаставаны сапраўдным французскім віном.

◆ ◆ ◆

На ўсіх канцэртах, якія прайшлі ў праграме фестывалю, найбольшы поспех у гледача атрымлівалі ўкраінскія госці — тэатр танца "Заповіт" Харкаўскага інстытута культуры. Іх выступленні былі проста бліскучымі, і зала па заслугах узнагароджвала артыстаў громам апладысментаў. Адчуваўся высокі прафесіяналізм калектыву, і гэта, як высветлілася ў час размовы з яго кіраўніком заслужаным работнікам культуры Украіны, загадчыкам кафедры харэаграфіі інстытута, дацэнтам Б.М.Калнагузенкам -- не выпадковасць. Усе яго



ўдзельнікі -- будучыя прафесіяналы ў танцавальным мастацтве, студэнты харэаграфічнага аддзялення. Барыс Мікалаевіч сам працаваў у вядомых творчых калектывах былога СССР, харэограф вышэйшай кваліфікацыі, адкрыў у Харкаўскім інстытуце культуры новую кафедру і стварыў гэты калектыў. У яго ён укладвае ўвесь свой талент, душу, сэрца, вольны час. А вынік гэтага -- створаная за параўнальна кароткі час /калектыву ўсяго 4 гады/ праграма з маленькіх спектакляў, у якой мовай лексікі народнага танца расказваюцца гісторыі з жыцця ўкраінскага народа, сцэнічна ўвасабляюцца розныя абрады Украіны. Адсюль і назва -- тэатр танца.

"Заповіт" ужо аб'ехаў не толькі сваю рэспубліку, краіны былога Саюза, але не аднойчы бываў у далёкім замежжы: Польшчы, Германіі, Бельгіі, ЗША. На фестывалях і конкурсах ансамбляў песні і танца ён заўсёды браў вышэйшыя ўзнагароды, атрымліваў ганаровыя дыпломы, прызы. Палова артыстаў маюць званні лаўрэатаў конкурсаў і фестываляў. А Вадзім Есауленка, Аксана Мірная, Аляксандр Білык удастоены персанальных стыпендый Украінскага цэнтра навукі і культуры, салістка тэатра -- выдатніца Карына Астроўская -- будзе атрымліваць стыпендыю прэзідэнта Украіны.

Цяпер Барыс Мікалаевіч плануе з рабятамі працу над праграмай "Барвы Украіны", у якой будуць адлюстраваны народныя абрады самых розных рэгіёнаў -- Прыкарпацця, Падолля, Цэнтральнага Палесся і г.д. Ён сам распрацоўвае ўзоры касцюмаў, іх стыль, вышыўку.



Дружба з "Радзімічамі" пачалася ў "Заповіта" з Міжнароднага конкурсу танца ў г.Краснаярску. Потым была сустрэча на Міжнародным маладзёжным фестывалі мастацтваў у г.Харкаве. Калі ўкраінскія сябры атрымалі запрашэнне прыехаць у Гомель на фестываль "Арт-сесія", прыклалі ўсе намаганні, каб зноў сустрэцца на гэты раз на беларускай зямлі. І не пашкадавалі, што трапілі на гэты фестываль, бо ён ім даў шмат цікавага і карыснага. У Барыса Мікалаевіча ўзнікла ідэя аб стварэнні сумеснай праграмы двух калектываў-сяброў -- "Радзімічаў" і "Заповіта".

**З агляду талентаў першакурснікаў**

## ГІСТОРЫКІ І ЮРЫСТЫ -- ЗНОЎ ПЕРАМОЖЦЫ

Агульнауніверсітэцкаму конкурсу "Ану, першакурснік!" сёлета пашанцавала. Ён увайшоў у праграму І Міжнароднага фестывалю моладзі "Арт-сесія", што надало яго ўдзельнікам пачуццё адказнасці вышэй звычайнага, бо маладыя таленты маглі бачыць і ацэньваць і замежныя госці.

Як і ў папярэднія два гады, зноў на вышыні аказаліся першакурснікі гісторыка-юрыдычнага факультэта. Без ніякіх ваганняў журы аднадушна прысудзіла ім першынство. Другімі аказаліся будучыя эканамісты. А вось студэнты геолага-геаграфічнага факультэта прыпаднеслі сапраўдны сюрпрыз: нарэшце, пасля многіх гадоў ігнаравання гэтым конкурсам змаглі сабрацца з духам і ... замахнуцца на прызавое трэцяее месца!

Пераможцаў чакалі дыпломы фестывалю "Арт-сесія", розныя прызы і сувеніры. Фундатар мерапрыемства -- рэкламнае агенцтва "Сов-Инфо" Дзяржаўнага навукова-вытворчага прадпрыемства "Эконэс" не пашкадавала сродкаў для заахвочвання пераможцаў. Рэжысёрска-пастановачнай групе ў складзе Івана Прысяжнага, Аляксея Яшчанкі і Андрэя Сыцько, якая падрыхтавала да конкурсу студэнтаў гісторыка-юрыдычнага факультэта, спонсарам устаноўлена імянная стыпендыя. Удзельнікі каманды-пераможцы атрымалі бясплатныя білеты на начную дыскатэку "Лайт", іншыя прызы.

/Матэрыял аб конкурсе чытайце ў наступным нумары нашай газеты/.

## РАЗВІТАЛІСЯ ДА НОВАЙ СУСТРЭЧЫ

Гала-канцэрт, які сабраў разам і ўдзельнікаў, і гасцей 7 лістапада, стаў заключным фестывальным акордам. На ім былі прадстаўлены самыя лепшыя нумары з яго канцэртных праграм. Усе яны выконваліся на асаблівым творчым уздыме.

За высокае выканаўчае майстэрства аргкамітэт фестывалю ўзнагародзіў многія калектывы навучальных устаноў нашага горада, а таксама замежных дэлегацый ганаровымі дыпломамі. Яны ж атрымалі таксама сувеніры і кветкі.

Госці з Шатландыі выказалі сваю шчырую падзяку гамяльчанам за іх гасціннасць, цёплы прыём. У знак удзячнасці яны падарылі універсітэцкай народнай харавой капэле "Дзянніца", з якой моцна пасябравалі за фестывальны тыдзень, памятны герб горада Абердзіна.

І вось наступілі сумныя мінуты развітання са сцягам І-га Міжнароднага фестывалю "Арт-сесія". Але аптымістычна прагучалі словы аб тым, што зноў, тут у Гомелі, у 1996 годзе ў другі раз ён збярэ старых і новых сяброў.

**Матэрыялы аб фестывалі падрыхтавалі карэспандэнт Т.Дубяк і У.Чысцік (фота).**

ЮБІЛЯРЫ

# СТАЛАСЦЬ І МАЛАДОСЦЬ "РАДЗІМІЧАЎ"





Адной з самых яркіх падзей на фестывалі стаў юбілейны вечар, прысвечаны 25-годдзю народнага фальклорна-харэаграфічнага ансамбля "Радзімічы" і 20-годдзю творчай дзейнасці яго мастацкага кіраўніка і балетмайстра Аляксандра Лысянкова.

Для калектыву, які ўвесь час знаходзіцца ў творчым пошуку, чвэрць стагоддзя -- дата знамянальная. За гэты час ён дасягнуў многага: неаднаразова станавіўся дыпламантам, пераможцам розных фестываляў і конкурсаў, атрымаў ганаровае званне народнага, выступаў з канцэртамі не толькі ў нашай вобласці, рэспубліцы, цяпер ужо ў краінах СНД, але і на зямлі далёкай Францыі -- у правінцыі пабрацiма Гомеля -- Клермон-Ферана, дзе пазнаёміў французскіх сяброў з беларускім нацыянальным мастацтвам.

Таму невыпадкова ў саставе французскай дэлегацыі на фестывалі "Арт-сесія" аказаліся і кіраўнікі дэпартамента, дзе "Радзімічы" давалі мінулым летам свае канцэрты.

Калектыў славуты сваім высокім выканаўчым майстэрствам, а таксама рэпертуарам, які дапамагае прапагандаваць і захоўваць наша народнае мастацтва. Ім збіраецца і апрацоўваецца фальклорны матэрыял, і, дзякуючы яго ўвасабленню ў танцах на сцэне, працягваюць жыццё культурныя традыцыі ўжо не існуючых сёння вёсак нашай пакутлівай ад Чарнобылю Гомельшчыны.

На працягу двух дзесяцігоддзяў нязменна кіруе ансамблем А.Лысянкоў, які прыняў эстафету ад стваральніка калектыву Р.Гофмана. Аляксандр танцаваў тут яшчэ са студэнцкіх гадоў, і любоў да гэтай справы была настолькі моцнай, што ансамбль стаў потым часцінкай яго душы, жыцця. Шмат сіл, энергіі, цяжкай працы аддадзена ім "Радзімічам" /на пачатку ансамбль называўся "Калінка"/, але ж ёсць і адпаведная аддача -- шырокае прызнанне, высокая ацэнка гледача. Мабыць, не было б такога поспеху і без адданай работы ў гэтым калектыве балетмайстра Ларысы Рычковай, акампаніятара Сяргея Рудзяка, кіраўніка фальклорнай групы ансамбля Уладзіміра Птушанёнка, хармайстра Анжэлы Эбзеевай. І тым больш, без самых галоўных дзеючых яго асоб -- танцораў, не адно пакаленне якіх змянілася ў "Радзімічах" за 25 гадоў. У гэтым і складанасць -- пастаянная змена саставу ўдзельнікаў ансамбля /студэнцкія ж гады не вечныя/.

Калектыў-юбіляр, як кажуць, на адным дыханні паказаў на вечары сваю гадзінную канцэртную праграму. Агністыя беларускія танцы змяняліся лірычнымі, павольнымі, жартоўнымі прыпеўкамі. Багацце, прыгажосць касцюмаў, адточанасць кожнага руху танцораў, выдатны рэквізіт і афармленне сцэны -- усё гэта выдатна спалучалася ў адзіную гармонію, выклікала ў гледачоў сапраўднае задавальненне, стварала адпаведную прыўзнятую святочную атмасферу.

Шмат самых цёплых і шчырых слоў прагучала ў юбілейны вечар і ў адрас кіраўніка "Радзімічаў", і яго "дзяцей", як вобразна назваў А.Лысянкоў сваіх выхаванцаў.

Павіншаваць юбіляраў сабралася вялікая колькасць прыхільнікаў беларускага мастацтва. Шчыра дзякавалі за высокае майстэрства, жадалі новых творчых поспехаў калектыву рэктар універсітэта акадэмік Л.А.Шамяткоў, які ўручыў А.Лысянкову прывітальны адрас, Ганаровую грамату, грашовую прэмію, намеснікі старшыні аблвыканкома і гарсавета А.М.Ярчак і В.М.Карніенка /імі перададзены калектыву грашовыя сумы на далейшае яго развіццё/, работнік Міністэрства адукацыі і навукі рэспублікі Я.А.Міхнюк, галоўны спецыяліст Міністэрства культуры Беларусі У.А.Мамонька, кіраўнікі дэлегацый з Шатландыі, Францыі і Украіны. Калектыву ўручылі ганаровыя граматы, дыпломы, сувеніры.

Не маглі не прыехаць у гэты вечар на юбілей "Радзімічаў" тыя, з каго гэты ансамбль пачынаўся, -- Леанід Каханчык, Павел Фёдараў, а таксама ўдзельнікі творчых калектываў студэнцкага клуба ГДУ, якія ўжо даўно закончылі вучобу, але працягваюць выступаць на універсітэцкай сцэне не толькі самі, але і са сваімі дзецьмі.

Віталі сваіх старэйшых таварышаў па творчасці і дзіцячыя танцавальныя калектывы горада.

А найбольш кранальныя словы выказалі самі танцоры "Радзімічаў" свайму кіраўніку А.Лысянкову, які стаў для іх "хросным бацькам", адначасова і патрабавальным, і вельмі чалавечным, з абаяльнасцю і душэўным унутраным святлом.

Вялізны імянінны торт, падараваны юбіляру прафкомам студэнтаў, прывёў у захапленне ўсю залу. Пакаштаваць яго віноўнікі ўрачыстасці запрасілі ўсіх жадаючых.

...Таленавітасць, творчасць, натхнёнасць вядуць "Радзімічаў" наперад. Яны -- у пары сваёй сталасці і маладосці.

Т.НІКАЛАЕВА.





НЕКАЛЬКІ АБЗАЦАЎ ПРА ШТОСЬЦІ САЛОДКАЕ

# ЁСЦЬ МАЙСТРЫ КУЛІНАРЫІ. ЁСЦЬ !!!

Вось і прайшоў такі доўгачаканы, такі салодкі конкурс, які адбыўся 2-га лістапада ў фае актавай залы універсітэта. Вельмі шкада, што не ўсе прыхільнікі ласункаў змаглі прысутнічаць на ім. Але ўдзельнічаць у ім прадставілася магчымасць усім жадаючым. І трэба прызнаць: там было на што паглядзець і што пакаштаваць.

Усе "гаспадынькі" і, што вельмі прыемна -- прадстаўнікі моцнага полу, пастараліся ад душы і на славу. На конкурс былі прадстаўлены кандытарскія вырабы, джэмы, варэнні, лікёры, віны і нават экзатычныя стравы, сярод якіх -- дэсертны салодкі салат. А вось супрацоўніца ІВЦ Т.Кадол вынесла на прысуд журы калісьці вельмі папулярныя традыцыйныя блінчыкі з макам.

Асаблівую ўвагу журы звяртала на мастацкае афармленне вырабаў і на тое, як адбывалася іх абарона. Так-так, я не агаварылася, менавіта абарона.

Кожны кулінарны твор трэба было прадставіць, расказаць аб тым, чаму менавіта ён прыгатаваны на конкурс і чаму названы так, а не інакш. Некаторымі аўтарамі былі напісаны да іх нават паэтычныя радкі. І паверце мне, што зрабіць гэта было не лягчэй, чым спячы торт або прыгатаваць лікёр.

Самым цікавым і нечаканым чынам была прадстаўлена работа "Лебядзіная вернасць". Яна нарадзілася ў садружнасці матэматыкаў Е.Гайковай, Н.Баевай, Т.Галдобінай і фізікаў А.Скакуна, Ю.Цімошчанка. Гэтыя рабяты яшчэ раз абверглі сцвярджэнне аб тым, што фізікі не могуць быць лірыкамі. На самой справе ўсё аказалася наадварот: работа была прадстаўлена не толькі з гумарам і ў вершах, але і танцам.

Прыемна таксама адзначыць, што жаданне адной са студэнтак прыняць удзел у конкурсе было такім вялікім, што нават хвароба не змагла перашкодзіць ёй прадставіць на яго сваю работу. Але, на жаль, мы не ўбачылі самога аўтара. Вікторыі Якаўцавай давялося застацца дома, а яе выраб прадставіла мама.

Канешне, аб удзельніках конкурсу і іх шэдэўрах можна было б гаварыць яшчэ доўга, але мне хацелася б адзначыць "мужнасць", "стойкасць" і кампетэнтнасць журы. Усяго было так шмат, а ім неабходна было ўсё пакаштаваць і аб'ектыўна ацаніць: не толькі пірагі і варэнне, але і віны. І журы, у саставе якога былі М.В.Селькін, М.М.Воінаў, Т.М.Соцiева, Н.І.Колтышава, Т.А.Ваўчкова, Н.М.Лысянкова, з гонарам выйшла з гэтага выпрабавання.

А самай прыемнай для гасцей і балельшчыкаў была, як вы ўжо здагадаліся, дэгустацыя кулінарных вырабаў. Жадаючых іх пакаштаваць сабралася шмат. І сярод іх -- нашы французскія госці, якім надзвычай цікава было ўбачыць, што ж гэта такое беларуская кухня. З дапамогай перакладчыцы яны выказвалі аўтарам кулінарных твораў сваё захапленне, бралі рэцэпты на іх прыгатаванне.

Адпаведную святочную атмасферу надавалі кулінарнаму конкурсу вясёлыя скамарохі. А пакуль журы праводзіла ацэнку страў, гасцям дапамагалі не сумаваць і на нейкі час адцягнуць увагу ад найсмачнейшых разнастайных пахаў, якія літаральна віселі ў паветры, удзельнікі дзіцячага ансамбля танца са школы мастацтваў.

Вось так праходзіла гэта смачнае і вясёлае свята, на якім задавальненне атрымалі не толькі ўдзельнікі, але і госці. А цяпер мне хацелася б назваць аўтараў лепшых, на думку журы, вырабаў на гэтым свяце кулінарнага мастацтва. Лепшы торт быў у Г.Канавалавай, лепшы булачны выраб -- у В.Варонінай. Асабліва была адзначана журы кампазіцыя Г.Гатальскай "Пяшчота". Лепшым напіткам аднадушна прызнаны лікёр "Малако дзікай буйваліцы" /аўтар М.Казлоў/. А самы вышэйшы прыз -- Гран-пры -- заваяваў, і няхай гэта натхняе мужчынскую палову універсітэта, Аўсеенка Сяргей Уладзіміравіч, асістэнт кафедры батанікі і фізіялогіі раслін. Яго чайны стол, адпаведна з вялікім густам аформлены знешне, уяўляў сабой цэлы набор разнастайных ласункаў Усходу.

Усе ўдзельнікі конкурсу былі ўзнагароджаны каштоўнымі падарункамі. Салодкае, смачнае свята было б немагчымым без удзелу спонсараў -- завода пластмасавых вырабаў, вытворчага аб'яднання "Карал", ВА "Белэмальпасуда", завода станочных вузлоў. Вялікае ім дзякуй за гэта!

А.КАДОЛ, студэнтка 2-га курса гісторыка-юрыдычнага факультэта.



На здымку: пераможца конкурсу С.У.Аўсеенка з каштоўным прызам -- пыласосам.

Фота У.Чысціка.

МАРАЛЬ

## СЛЯДЫ РАЗГУЛУ

Заўважана, што студэнты нашага універсітэта не вызначаюцца дысцыплінаванасцю, культурай паводзін, ашчаднасцю да дзяржаўнай маёмасці. Некаторыя з іх здольныя на ўсякае паскудства. Яскравым прыкладам гэтага стаў першы дзень атрымання кастрычніцкай стыпендыі. Выдадзеныя беларускія звяркі неяк непрадказальна паўздзейнічалі на асобных стыпендыятаў. Ці то ад задавальнення, ці то па якой-небудзь іншай прычыне, але яны праявілі вельмі буйны характар. У выніку аказалася пабітай сантэхніка ў мужчынскім туалеце трэцяга паверха галоўнага корпуса, засталіся іншыя сляды ад адурманеных алкаголем мазгоў.

Тут без адміністрацыйнай прафілактыкі і "лячэння" абысціся нельга. Нават не шкада будзе развітацца з тымі, хто яшчэ не навучыўся прыстойна весці сябе ў сценах універсітэта.

Да сказанага трэба дадаць: кіраўніцтву універсітэта трэба рашуча паставіць пытанне аб выкананні загада па строгай забароне курэння ва неўстаноўленых месцах.

СПОРТ СПОРТ СПОРТ

ГАНДБОЛ

## ПЕРААДОЛЕНЫ ПЕРШЫ РУБЕЖ

Другі год запар жаночая каманда па ручному мячу "ВВВ - - Універсітэт" удзельнічае ў розыгрышы Еўрапейскага Кубка кубкаў. Летась нашы дзяўчаты выбылі з турніра ўжо на першым этапе, прайграўшы абедзьве сустрэчы польскім гандбалісткам.

Сёлета старт аказаўся больш паспяховым. Першым супернікам нашай каманды быў швейцарскі клуб "СПОНО" з невялікага гарадка Нотвіл. Па дамоўленасці абедзьве гульні адбыліся ў Швейцарыі. У першай сустрэчы з перавагай у 11 мячоў перамаглі нашы гандбалісткі, а ў другой -- уступілі адзін мяч. Па суме забітых і прапушчаных мячоў гамяльчанкі выйшлі ў другі круг, у якім сустрэнуцца з больш моцнымі саперніцамі -- камандай "Барусія" (Дортмунт) з Германіі.

Як і першыя, гэтыя дзве сустрэчы па дамоўленасці таксама адбудуцца на пляцоўцы саперніц -- 18 і 20 лістапада.

## ПАКУЛЬ ШТО БЕЗ СТРАТ

Мацнейшыя жаночыя каманды рэспублікі па ручному мячу /а іх восем/ пачалі барацьбу за ўзнагароды чарговага чэмпіянату. Утвораны дзве паўфінальныя падгрупы. На першым этапе саперніцамі нашых гандбалістак сталі каманды "Друць" з раённага цэнтра Бялынічы Магілёўскай вобласці, гродзенскага "Нёмана" і "Дынама" /Бабруйск/. Гульні першага тура адбыліся ў спартыўным лёгкаатлетычным комплексе "Дынама" у Гомелі. Нашы гандбалісткі аказаліся значна мацнейшымі за саперніц. Яны паслядоўна перамаглі дзяўчат з Бялыніч з лікам 38:22, спартсменак з горада над Нёманам -- 44:17 і бабруйскіх дынамавак -- 31:16.

Сярод нашых гандбалістак, як адзначыў трэнер каманды В.Крукоўскі, найбольш вызначылася Наталля Дарапіевіч. На яе рахунку 23 закінутыя мячы. Высокае майстэрства прадэманстравалі таксама Анжэліка Кукбая і Раіса Ціхановіч.

У другой падгрупе таксама трох перамог дабіліся чэмпіёнкі рэспублікі -- мінская каманда "Політэхнік". Яна і "ВВВ-Універсітэт" узначалілі турнірную табліцу.

## ФЁДАРАЎ ФЁДАР ІВАНАВІЧ

На 84-м годзе жыцця раптоўна памёр буйнейшы фізік-тэарэтык, адзін з заснавальнікаў і арганізатараў фізічнай навукі ў Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, лаўрэат Дзяржаўных прэмій СССР і БССР, прэзідэнт Беларускага Фізічнага Супольніцтва, член Прэзідыума АНБ, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, акадэмік АН Беларусі Федар Іванавіч Фёдараў (сын вядомага беларускага пісьменніка Янкі Маўра).

Вялікі ўплыў навуковая і педагагічная дзейнасць Ф.І.Фёдарава зрабіла на развіццё фізічнага факультэта нашага універсітэта. Вынікі яго даследаванняў увайшлі ў праграмы вучэбных дысцыплін факультэта і шырока выкарыстоўваюцца ў вучэбным працэсе. Фёдар Іванавіч уважліва сачыў за навуковай дзейнасцю гомельскіх оптыкаў і фізікаў-тэарэтыкаў. Неаднойчы ён быў ва універсітэце і ўзначальваў міжнародныя навуковыя школы і канферэнцыі, якія праводзіліся ў ГДУ па оптыцы. Сярод тых, хто працаваў раней ці працуе ў ГДУ зараз, да навуковай школы Ф.І.Фёдарава належаць адзін акадэмік, пяць дактароў і 15 кандыдатаў навук. Аддаючы даніну павагі навуковай і педагагічнай дзейнасці з улікам асабістых якасцей выдатнага даследчыка, вучоны савет ГДУ і Міністэрства адукацыі яшчэ пры яго жыцці заснавалі дзве стыпендыі імя акадэміка Ф.І.Фёдарава для лепшых студэнтаў фізічнага факультэта ГДУ.

Мы ў глыбокім смутку з прычыны смерці Вучонага і Чалавека. Нам вельмі будзе не хапаць яго патрабавальнай увагі да вынікаў нашай працы, яго мудрых парад. Але мы спадзяемся, што з гонарам падтрымаем сцяг беларускай навукі, які столькі гадоў трывала быў у руках Фёдара Іванавіча. Светлая памяць аб ім заўсёды будзе жыць у нашых сэрцах.

**РЭКТАРАТ ГДУ імя Ф.СКАРЫНЫ,
КАЛЕКТЫЎ ФІЗІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА.**


**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

-- эканамічных тэорый -- асістэнта;
-- рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства -- асістэнта;
-- ВМ і праграміравання -- асістэнта;
-- палітычнай сацыялогіі -- асістэнта;
-- правазнаўства -- асістэнта;
-- рускай літаратуры -- асістэнта.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699 г.Гомель, вул. Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**


Рэктарат, калектыў эканамічнага факультэта, Савет ветэранаў вайны і працы глыбока смуткуюць з выпадку смерці актыўнага ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны, персанальнага пенсіянера, былога выкладчыка эканомфака **ДУБРОЎСКАГА** Пятра Андрэевіча і выказваюць спачуванне яго родным і блізкім.

Рэктарат і прафсаюзная арганізацыя універсітэта выказваюць глыбокае спачуванне бухгалтару прафкома **ВАЛЧКОВАЙ** Таццяне Аляксееўне з выпадку напаткаўшага яе гора -- смерці **БАЦЬКІ.**


Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

"Гомельскі універсітэт" -- газета Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.

Рэгістрацыйны № 221

Спонсары газеты -- Цэнтральны райсавет народных дэпутатаў г. Гомеля; НВП "Сучасныя тэхналогіі", прафком студэнтаў.

Газета набрана і вёрстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, адрукавана на Гомельскай фабрыцы "Палесдрук".

Рэдактар Ул. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.500 экз.
Заказ

Падпісана да друку 11.11.94.